Бешт паштовай перасылкі аплачана агулам.

№ 16 Нядзеля, 24 Жніўня 1924 г. Год I.

ГРАМАДЗКІ ГОЛАС

Выходзіц[illegible] два разы ў тыдзень. Цана нумару 15 грошай.

Падпісная цана [illegible]сяц 1 злоты 20 гр. За гран[illegible]у ўдвая даражэй.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Людвісарская вул. дом № 4. (Wilno, Ludwisarska 4). Рэдакцыя адчынена ад 10—2 гадз. Рэдактар прымае ад 11—1 гадз. удзень, апрача сьвятаў.

Цана абвестак за радок пэтыту: на 1 стар. — 15 гр. у тэксьце — 10 гр. на апош. стар. — 5 гр.

Ад Рэдакцыі і Адміністрацыі.

Падпісчыкі й чытачы, нашае газэты, якія ўнясуць падпісныя грошы **за ўвесь час да канца бягучага году,** адтрымаюць у канцы гэтага году, як БЯСПЛАТНАЕ ПРЫЛАЖЭНЬНЕ да газэты, вялікі

КАЛЕНДАР-КНІЖКУ

на 1925-ты год. Календар гэты, які цяпер падрыхтоўваецца да выданьня, будзе зьмяшчаць у сабе самы абшырны матар'ял, даючы магчымасьць кожнаму беларускаму селяніну й інтэлігэнту знайсьці для сябе самым найпрасьцейшым шляхам усе патрэбныя спраўкі й парады, як праўнага характару, так асабліва і з галіны сельскае гаспадаркі.

Ці слабасьць, ці што іншае?

У шырокіх кругох польскага грамадзянства пануе не саўсім вернае перакананьне, быццам наш беларускі рух яшчэ настолькі слабы і культурна малады, што трудна яго трактаваць сур'ёзна, можна як быццам і пачакаць, пакуль рух гэты не дасьпее, а тады, разумеецца, што народ беларускі можа прыступіць да рэалізацыі сваіх ідэалаў.

Заўважаецца, гэткім чынам, прызнаваньне ўнутранае слабасьці беларускага грамадзянства, ўсіх беларускіх культурных сіл разам узятых.

Нельга не згадзіцца, што пэўны момэнт слабасьці ёсьць і тлумачыцца ён гістарычнымі варункамі жыцьця нашага народу, як народу, навет культурна пераможанага дужэйшымі, аддаўшага ня мала сваіх культурных сіл на служэньне чужым культурам.

Але-ж, ці напраўду гэтак ужо слабы беларускі народ, як можа здавацца, гледзячы збоку?

На гэтае пытаньне адным словам адказаць трудна.

Трудна дзеля таго, што самае ўдачнае слова нікога не задаволіць.

Здаецца нам, што было-б найлепей падыйсьці да разгляданьня жыцьцяздольнасьці нашага народу і яго права на свой уласны нацыянальны быт ня з боку простага констатаваньня сучасных момэнтаў слабасьці, а з боку імпотэнтнасьці, нявыяўленасьці ўсіх беларускіх сіл.

Бо хто-ж падлічыў увесь нацыянальны беларускі багаж, пушчаючыся ў падарожу да тых ці іншых, пастаўленых перад сабою, палітычных мэтаў?

Ніхто нічога й ніколі не падлічаў. Палітычны рух, падняты віхрам рэвалюцыі мімаволі пераняў ад гэтае самае рэвалюцыі тыповую яе азнаку — недахват сыстэмнасьці. Кожная рэвалюцыйная эпоха вельмі багата самымі рознароднымі пытаньнямі, якія родзяцца ў гарачых галовах стрывожаных масаў і арганізованых партыйных групаў. Але кожнаму вядома, што рэвалюцыйны віхар ніколі не дае магчымасьці людзям пазытыўнае працы скамбінаваць з усіх бакоў абдуманы, сыстэматычны плян разрашэньня таго, ці іншага паўстаўшага пытаньня.

І вось дасюль, дзякуючы таму, што беларусы шляхам расейскае рэвалюцыі выйшлі на ясны сьвет з фармальнае турмы народаў — Расейскае Імпэрыі, — не назьбіраўшы дый нямогшы назьбіраць за час няволі тых нацыянальна-культурных каштоўнасьцяў, якія для новага сьвядоманацыянальнага жыцьця патрэбны інтэлігэнцыя беларуская, прызваная народным рухам рабіць палітычныя хады ў нацыянальнай справе, была далёкай ад самага простага апрацоўваньня перш за ўсё акуратнае сыстэмы гэтых хадоў, ад устанаўляньня этапаў на цяжкім шляху да блісьнуўшага пры сонцы свабоды нацыянальнага ідэалу.

Нэрвовасьць, непрымірымасьць з грубым рэалізмам а ні на момэнт, вось што зьядае сілы палаўшае гуртавацца беларускае інтэлігэнцыі.

У нас як быццам ніхто й нязгодльны да ўпартае чорнае працы, да мэтодычнага разрашаньня стаўляных бягучым жыцьцём задачаў. Затое нідзе, як у нас, нельга знайсьці гэткага багацьця на індывідуальнасьці, якія лічаць сябе прызванымі рабіць высокую палітыку і толькі палітыку. А гэта папросту якраз і прынята называць... палітыканствам.

У нас хапае аж занадта высокага палёту, калі трэба прынцыпіяльна прыняць на паперы тую ці іншую пастанову, але рэдка хто задумаецца над тым, як уклясьці ў прынцыпіяльна вырашанае пытаньне рэальны зьмест.

Характарная рыса рэвалюцыйнае эпохі — рэвалюцыйнасьць — туга выціскаецца з беларускага грамадзкага жыцьця.

Самая маленькая спроба якойнібудзь беларускай групы падыйсьці да бясспрэчна карыснае ў агуле беларускага руху рэальнае працы, зараз-жа выклікае ні то зайздрасьць ні то падазроннасьць іншае беларускае групы і выходзіць заўсёды так, што да кожнае навет маленечкае справы інтэлігэнцыя наша можа падыйсьці ня йначай, як загадзя расьпісаўшыся па партыях.

Гуртколўшчына пагражае зрабіцца нейкім спэцыфічна беларускім культам. Адсутнасьць арганізованнасьці ў масах не выпірае на парадак дня навет факту партыйнага жыцьця і партыйныя ярлыкі на паасобных групах ці дзеячох моцна пахнуць палітычным сэктанствам. А сэктанства-ж, заўсёды, замыкаючыся ў сабе, размнажае нецярпімасьць да ўсяго, што знаходзіцца па-за межамі яго рамак.

Інэртнасьць шырокіх слаёў беларускае інтэлігэнцыі ў адношаньні да нацыянальна-грамадзкага жыцьця дала магчымасьць вытварыцца нейкай *непаграшымай* групе ў палітычным заходнябеларускім жыцьці і нявольна складаўся ўнутры самое гэтае групы шкадліvы пагляд на сябе, як быццам і сапраўды яна непаграшымая, як быццам толькі яна адна мае манапольнае права задаваць тон масам і аднача сна каваць культурныя беларускія каштоўнасьці.

Дый дасюль так і вялося. Ніхто з беларусаў і рота не разявіў, каб запротэставаць проці няправільных, нетактоўных хадоў манапольных палітыкаў. Не запротэставаў-бы напэўна і тады, калі-б вялікія, заслужаныя, патэнтованыя, ці яшчэ як іх там, дзеячы сягоньня орыентаваліся на Кітай, а заўтра ужо на Бразыльскую рэспубліку, пасьлязаўтра ізноў на што-нібудзь новае.

А ў зманапалізаваўшай беларускае палітычнае жыцьцё групе, можа навет і не благіх фанатыкаў нацыянальнае ідэі, натуральным спосабам рэсло і мацнела хваравітае перакананьне, быццам усё, што яна сама, гэтая група, зробіць заўсёды выглядае добра, а усё што ня ёю робіцца — нявартa нічога, яшчэ горай — аддае нацыянальнай здрадаю, крыміналам, простым праступленьнем проці роднага народу.

А непаграшымая група можа сабе пазваляць гульню ў тайную дыплёматыю, ў найвышэйшую палітыку, ў опэрэтачных дыктатараў проблематычна ўзятага ідэалу. Можа саўсім папартацку скамбінаваць парлямэнтарную рэпрэзэнтацыю ў Польскім Сойме і цьвярдзіць, што гэта выглядае ідэальна, што лепей і быць ня можа. І беларускі дэмос маўчыць, нечага чакае.

Аднак жыцьцё ў не-рэвалюцыйных, нармальных рамках ня можа згадзіцца з непаграшымасьцю палітычнае сэкты, бо яе дзейнасьць прыводзіць да балючых праяваў у жыцьці народных масаў, яе дэмагогічныя абяцанкі нечага лепшага ў будучыне ня могуць задаволіць бягучых народных патрэбаў.

І народ рана ці позна гэта зразумее. Сьвядомаю нацыянальнаю грамадою падойдзе да папраўленьня свайго лёсу, павам жна, арганізованна і паступова, разрашаючы свае нацыянальныя заданьні адно за адным. Наш народ, як і ўсякі іншы, сам выявіць

сваю ўласную нацыянальную моц, якую пачне шанаваць кожны разумны чалавек. Бо моц гэта заўсёды існуе ў народзе.

Што-ж цяпер засланяе беларускую нацыянальную моц, выглядаючы, як нацыянальная слабасьць?

Палітычная нецярпімасьць унутры беларускага грамадзянства, і значыцца — ня слабасьць нашу відаць а хваробу, якая, ў кожным выпадку, можа лічыцца толькі часоваю.

І час ужо пачаць спакойна адносіцца да гэтага зьявішча; яно пераходнае.

Калі жыцьцё пачне ўваходзіць у нармальныя рамкі і створыць варункі конкрэтнай працы нашае інтэлігэнцыі ў кузьнях нацыянальнае культуры, дык агітатарскія элемэнты сяродінтэлігэнцыі зьнікнуць самі сабою. Конкрэтная праца на шырокай ніве роднае культуры найлепей затуліць ім рот, аб жыцьцяздольнасьці і самабытнасьці беларускага народу засьведчаць жывыя плады нашае культурнае творчасьці і згіне тое, што дзе-каму здаецца сягоньня нацыянальнаю беларускаю слабасьцю, бо для вузкага, гуртковага палітыканства не застанецца месца.

І чым хутчэй створаны будуць варункі для паступовага, але ўсестароннага разьвіцця беларускіх нацыянальных асабліваcьцяў у сваім родным краі, тым хутчэй зьнікне ў нас прыкрая вострасьць нацыянальнага антаганізму ды аздаравіцца краёвае жыцьцё.

Газэту прачытай і перадай суседу!

Той, хто умее чытаць, ніколі не паляннуйся прачытаць няпісьменнаму!

Палітычны агляд.

Рэзультатамі Лёнданскай конфэрэнцыі саўсім задаволены ў Лёндане і незадаволена француская опозыцыя на чале з ранейшым прэм'ерам Пуанкарэ, якая зробіць строгую крытыку лёнданскага трактату ў парлямэнце. Затое вельмі задаволены левыя францускія кругі і дзеля гэтага можна быць пэўнымі, што ён будзе прыняты большасьцю францускае палаты. Гэтак-жа сама цяпер ёсьць пэўнасьць, што лёнданскі трактат будзе прыняты патрэбнаю большасьцю і ў нямецкім парлямэнце, ня гледзячы на вострую крытыку яго нацыяналістамі, якія протэстуюць болей для чужога вока ды з тактычных пабуджэньняў, таму што папраўдзе лёнданскае паразуменьне зьяўляецца поўнаю перамогаю Нямеччыны, дасягнуўшае паступленых мэтаў. У першыню Нямеччына радзілася ў Лёндане з саюзьнікамі, як роўныя з роўнымі і заняла пасьля гэтага ранейшае сваё палажэньне сярод вялікіх дзяржаваў сьвету, страчанае ёю пасьля праграная сусьветнае вайны. Крыху папсавала настрой у Парыжы і Брусэлі пісьмо Мак-Дональда, ў якім апошні выказвае надзею, што Францыя з Бэльгіяй па стараецца хутчэй ачысьціць Рускі район, як незаконна імі заняты. Найбольшую буру гэтае пісьмо выклікала ў Парыжы і Брусэлі сярод правых кругоў, якія абвінавачваюць Англію ў залішніх сымпатыях да Нямеччыны.

У той час, як саюзьнікі апошнім часам былі па вушы занятыя пытаньнем аб урэгуляваньні ўзаемаадносін паміж сабою і Нямеччынай, на Балканах, у Афрыцы і Азіі насьпеў цэлы рад буйных палітычных падзеяў. На Балканах бальшавікі працуюць як мага і дасягаюць навет некаторых удачаў. Цэнтрам камуністычнае пропаганды на Балканах служыла дасюль аўстрыяцкая сталіца Вена, куды савецкі ўрад выслаў у распараджэньне балканскага камітэту 40 мільёнаў залатых рублёў.

А ў апошні момэнт бальшавікі перанясьлі цэнтр пропаганды на Балканах з Вены ў Канстантынопаль, адкуль зручней будзе кіраваць рухам. Яны спадзяюцца зрабіць пераварот у Баўгарыі ў пачатку верасьня.

У краёх фашызму таксама ня ўсё ў парадку. У Італіі знойдзены, нарэшце, труп, пазьверску забітага, соцыялістычнага пасла Маттэотті і пахованы бяз эксцэсаў. Але палітычная сытуацыя ў краі паранейшаму застаецца надта напружанаю. Нядаўна адбылася буйная спатычка ў Нэаполі. Фашыстаўскія і проціфашыстаўскія элемэнты паранейшаму рыхтуюцца да рашучае бітвы. І ў той час, як фашысты яшчэ, пакуль што, захоўваюць сваю лічбенную перавагу ў вёсцы, на якой Мусоліні хоча абапёрці сваю ўладу, у гарадох штодня мацнее ўплыў антыфашыстаў.

Але куды горай складаецца палітычная сытуацыя для гішпанскага дыктатара Прыма-дэ-Рывэры. Гішпанскія фашысты, як ведама, скінулі ранейшы ўрад і захапілі ўладу, дзякуючы паражэньням гішпанскага войска ў афрыканскай колёніі Мароко. За гэта ранейшыя міністры трапілі ў вастрог або змушаны былі ўцячы за граніцу. Але цяпер гішпанскае войска панясло яшчэ большыя паражэньні. Згодна з апошнімі паведамленьнямі, уся чынная гішпанская армія ў Мароко акружана туземнымі плямёнамі і змушана будзе здацца ў палон. Не ўратавала ад паражэньняў і асабістая прысутнасьць на тэатры ваенных падзеяў самога дыктатара Прыма-дэ-Рывэры, якога, хіба што, ня міне сумны лёс яго папярэднікаў.

Вялікую няпрыемнасьць таксама робіць і Англіі паўстаньне ў Афрыканскай колёніі Судане, якая знаходзіцца на поўнач ад Эгіпту, адтрымаўшага нядаўна самастойнасьць. Паўстаньне гэтае падрыхтована і падтрымліваецца Эгіптам, які хоча прылучыць Судан да сябе. Гэткім чынам, цяжкае палажэньне ангельцаў у Судане заблутваецца яшчэ тым, што магчымы з-за яго конфлікт з Эгіптам. А затым наагул небясьпечна, каб гэты рух мусульман не перакінуўся на Індыю, ў якой таксама заўважаецца моцнае бражэньне і нядаўна дайшло ў некаторых месцах да буйных крывавых спатычак.

У апошні момэнт загарэлася паўстаньне ў Афганістане, на граніцы Індыі з Саюзам С. Р. Р. Бальшавікі якраз могуць і туды ўсунуць свой нос, таму што ніводнае паўстаньне ня можа абыйсьціся бяз іхняга простага ці пасрэднага ўдзелу. Яны навет арганізавалі пропаганду ў францускіх афрыканскіх колёніях, як на востраве Мадагаскары, асыгнаваўшы на школу пропаганды ў францускіх колёніях 3 мільёны рублёў золатам. А ў гэты самы час хочуць весьці перагаворы з Францыяй, падобныя да лёнданскіх.

І. С.

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

— Саюз запасных афіцароў апублікоўвае адозву на пытаньню аб абароне ўсходніх граніц, выказваючы перакананьне, што мір можа забясьпечыць на граніцы толькі войска, якое будзе каштаваць шмат таньней, як пагранічная паліцыя.

— Верхня-сілезкія прамыслоўцы заявілі, што прымаючы рабочых, яны будуць захоўваць правы, якімі апошнія карысталіся да забастоўкі. Гэта важна ў сэнсе забесьпячэньня рабочых і аплаты за выслугу гадоў. На работу сталі 75%. Процант безработных, дзякуючы энэргіі Ураду, паступова робіцца меншым.

— Рэзультатам нарадаў Палітычнага Камітэту Рады Міністраў у Спале будуць энэргічныя распараджэньні ў сэнсе павялічэньня компэтэнцыі гэнэрала Рыдза-Сьміглага.

Тыпы Палесься

(Глядзі № 15 „Грам. Голасу").

Той падняўся, прападаў недзе мінют з пяць, пасьля вярнуўся і, нахіліўшыся да мяне, шапнуў: — ёсь, хадзем!

Я ўстаў, да нас яшчэ прыстаў Караба і мы ўсе ўтрох няпрыкметна выбраліся з-за стала і пайшлі за Ганчаром.

Той завёў нас у гумно.

— Ось тутака ёсь драбіна, лезьце за мной! — парадзіў ён.

Хутка мы адзін за адным апыніліся сярод сена, дзе смачна заснулі.

Доўга я праз сон чуў сьмех і крыкі гуляўшых сяброў, але пасьля так моцна заснуў, што нават ня чуў, як ужо раніцай Ганчар з Карабой будзілі мяне і ніяк не маглі дабудзіцца.

Так прайшла ночка на хутары.

— Ну, і сьпіцё вы моцна! — казаў Караба.

— Я ўжо меркаваў, ці не памёрлі вы ад учарашняга самагону?! Ну, хадзем, пойдзем у хату, паглядзім маладую, — весела гаманіў ён, падміргіваючы мне, — па дарозе ля студні памыемся, — скончыў ён і мы выйшлі з гумна.

Хутка памыліся і ўвайшлі ў хату. Нас сустрэў Супрон словамі:

— А вось яны дзе, ўцекачы! А я ўчора шукаў, шукаў, дзе яны падзеліся, але ось дзе... Ну, ну, сядайце, сядайце! — весела гаманіў ён...

X.

Зноў ў дарогу.

Добра пасьнедаўшы, я падзякаваў усім сябром за добрыя, прыхільныя адносіны і пачаў зьбірацца далей у дарогу.

— А то пабылі-б у нас які дзянёк! — запрашаў Супрон.

— Вельмі дзякую, сябру, але бачыце часу мала, а аб'ехаць шмат абшару трэба, — казаў я.

— Гэта праўда, — згадзіўся ён, — ну, дык як назад будзеце ехаць, калі ласка, прашу не запамятавайце адведаць...

— Янка! — пазваў ён хлапца, — ось што, браток, адвязём ось сябру пад возера Князь да хутара Дзяніса... Ну, жыва, запрагай!

Праз мінют пяць, я сядзеў у возе. Цяжка было раставацца з сябрамі, а асабліва з Карабой і Ганчаром. Але што зробіш — доля наша такая!

— Но! — крыкнуў Янка на каня і мы крануліся.

— Шчасьліва! — казалі Супрон, Ганчар і Караба.

— Да пабачаньня! — грымела грамада, якая зноў пачала гуляць.

— Гэта вам ужо на дарожку! — сказала, падбегшы да воза, пачырванеўшая маладая і палажыла мне ў воз сыр, хлеб і кілбасу.

— А гэта, каб ехаць было добра! — сказаў Пётра, кладучы мне на калены бутэльку з самагонам.

Я падзякаваў. Воз крануўся.

— Бывайце здаровы! — крыкнуў я ўсім, зьняўшы шапку. — Не памінайце ліхам!

— Чакаем! чакаем! — грымела мне ў адказ.

Уехалі ў лес.

Усё жыло ў ім, цешылася з сонца, а мне было сумна на душы, цяжка на сэрцы...

— Хто п'е, таму налівайце! — данёсься да мяне нечы голас з гуляўшых хлопцаў на хутары...

Пеце хлопцы! Гуляйце пад шум лесу і гоман ціхі хваляў роднае рэчкі! Гуляйце!

Пакуль не пакліча вас доля старонкі роднай!

Цягнецца лес сьцяною, птушкі пяюць, весела сонца сьмяецца...

XI.

У Дзяніса.

Ужо сонца садзілася. Ужо цені гусьцей зграмадзіліся і змоўклі птушак песьні, як мы з вялікай грэблі зьйшлі ў бок і хутка апыніліся ля тыну, якім была абгароджана ўся маемасьць Дзяніса. На падворку забрахаў сабака і праз мінюту сівы, як голуб, вышаў да брамы Дзяніс.

— Як маецеся, дзедка? — зьвярнуўся я да яго.

Той падазронна ўглядаўся на мяне, раптам у яго вырвалася:

— Ах Ты, Божачка, далібог, не пазнаў!.. І ён хутка пачаў адчыняць браму.

Мы заехалі на падворак.

— Ну, хутчэй, хутчэй, хадзем у хату, цягнуў ён мяне, — вось будзе Міхась рады...

— У памяшканьні тэкстыльнага саюзу ў Варшаве арыштована 150 чалавек, аб якіх паліцыя мела ведамасьці, што яны належаць да камуністычнай моладзі.

За граніцай.

— У **Пэкіне** аднавіліся японска-савецкія перагаворы.

— Пасьля заключэньня дагавору з Кітайшчынай, бальшавікі пачалі займаць расейскія консульскія будынкі ў Кітаі. Перш за ўсё занята консульства ў Ханькоу.

— З прычыны савецка-кітайскага паразуменьня аб Усходня-Кітайскай чугунцы, японцы стараюцца разьвіць свае чугуначныя лініі і аднавіць чугунку ад Дайтэна (Дальняга) да Харбіна.

— Паўстаньне ў **Афганістане** выклікала трывогу сярод бальшавікоў. „Известия" востра нападаюць на ангельскую колёніяльную палітыку. Як ім здаецца, паўстаньне выклікана брытанскімі агентамі, таму што Англія пастанавіла зьнішчыць новы дзяржаўны лад, заведзены нацыянальным сабраньнем. На другі дзень пасьля падпісаньня англа-савецкага дагавору ангельская колёніяльная дыплёматыя аднавіла свае атакі проці афганцаў, якія боруцца за сваю незалежнасьць.

— 21-га жніўня на паседжаньні камісіі загранічных справаў **нямецкага** парлямэнту, канцлер Маркс, адказваючы па запрос, заявіў, што калі да 30-га жніўня ўрад не атрымае ад парлямэнту $2/3$ галасоў, дык будуць выкарыстаны ўсе конституцыйныя магчымасьці, каб схіліць парлямэнт да прыняцьця закону, на які апіраецца плян Дависа.

— У **Даніі** пачалася страшэнная газэтная полеміка вакол проекту аб скасаваньні арміі. Палкоўнік Голек у „Berl. Tidende" даказвае, што паліцэйскі корпус у 7,000 чалавек лёгка можа зрабіцца корпусам прэторыянцаў, якім могуць карыстацца для проціконстытуцыйных варожых дзяржаве мэтаў. А прыхільнікі раззброеньня даказваюць, што Даніі лепей адразу прызнаць свой нэйтралітэт — бо ў праціўным выпадку трэба прыступіць да будаваньня паветранага флёту, але гэта зрабіць дзяржава ня мае за што.

— У **Гданску** паліцыя арыштавала атамана Махно і высылае яго, як непажаданага чужаземца.

— 21-га жніўня ў **французскім** парлямэнце прэм'ер-міністар Эрыо прачытаў урадовую дэклярацыю, даводзячы, што лёнданская конфэрэнцыя ішла пад знакам французскіх лёзунгаў, якія зрабілі ўплыў на прыняцьце прынцыпу перадачы трацейскаму суду ўсіх спрэчных пытаньняў.

— 20-га жніўня на паседжаньні **маскоўскае** рады, пасьля дакладу Ракоўскага аб лёнданскіх перагаворах, Чычэрын заявіў, што самы факт заключэньня дагавору мае першараднае значэньне для саветаў.

— У **французскай** палаце камуніст Марті прапанаваў адлажыць дыскусію аб лёнданскай конфэрэнцыі да таго часу, пакуль сэнат не разгледзіць проекту аб амнэстыі. Камуністы з соцыялістамі ледзь што не пабіліся. Прапазыцыя Марті палатаю адкінена.

— Конфэрэнцыя міністраў загранічных справаў **Малое Антанты** адбудзецца ў Любляне 30-га гэтага жніўня. Мае разглядацца расейскае пытаньне і сытуацыя, створаная лёнданскаю конфэрэнцыяй.

— **Лёнданская** гандлёвая палата аднагалосна запротэставала проці англа-савецкага дагавору і проці стараньняў ангельскага ўраду знайсьці пазычку для бальшавікоў.

— У „Правде" Зіноўеў прызнае без агаворак, што неўраджай ахапіў большы лік губэрняў, як думалі раней. Палажэньне здаецца яму сур'ёзнейшым, як у 1921 годзе.

— Бывшы вялікі князь Кірыла Валадзіміравіч паслаў ангельскаму ўраду пісьмо, ў якім протэстуе проці дагавору з С. С. Р. Р. Ен даказвае, што пазычка ўзмацніла-б камуністычную пропаганду.

— З Масквы паведамляюць аб тым, што рэвалюцыя проці афганскага эміра разрастаецца. Паўстанцы на чале з Абу-ханам занялі Кабул.

— Паведамленьне аб новым замаху на югаславянскага аташэ ў **Софіі** выклікала ў Белградзе агульнае ўзварушэньне. Міністар загранічных справаў Марынковіч радзіўся з прэм'ерам Давідовічам аб пасылцы ноты Баўгарыі. Нота будзе ў надта вострым тоне.

— Нямецкі пасол у **Вэнгрыі** патрэбаваў выдачы Фэрэтуа, забойцы Эрцбэргэра, быўшага нямецкага міністра.

Бальшавіцкі пірог.

Беларускі рух за апошнія пяць гадоў пайшоў шпаркім тэмпам і ў сучасны момэнт, ужо вельмі, рэдка спаткаем, у нас на Бацькаўшчыне, чалавека, які-б на запытаньне: „хто ты?" ня даў пэўнага адказу аб сваёй нацыянальнасьці.

Але чым больш Беларускі народ пачынае самаазначацца, тым болей робіцца яго жыцьцё трагічным.

Бо наша Бацькаўшчына, будучы падзелена Рыскім трактатам на дзьве паловы, ўлівае у народ некалькі кірункаў палітычнага сьветагляду. Ідзе, гэтак кажучы, канкурэнцыя паміж дзьвюх дзяржаваў, якія стараюцца прыцягнуць сымпатыі Беларускага народу да сябе.

Адна з іх, бачачы, што беларусаў да сябе магчыма прыцягнуць толькі тым, што даць ім магчымасьць пашыраць сваё нацыянальнае адраджэньне ў большым маштабе — дае ім шырокую аўтаномію, незалежнасьць, як кажуць, на паперы — гэтаю першаю дзяржаваю, ўгледзеўшаю карысьць для сябе ў выробленьні сымпатыі, зьявілася Радавая Расея...

Яшчэ ў 1919, 1920 і 1921 гадох радавая ўлада не дае магчымасьці беларусам вясьці працу свайго адраджэньня, называючы ўсе беларускія нацыянальныя установы контр-рэвалюцыяй, але ось бачачы, што барацьба з беларускім народам ніякай карысьці ня прынясе — хутка мяняе палітыку і пачынае ісьці на спатканьне беларускаму руху.

Беларускія інтэлігэнтныя сілы пачынаюць ужо глядзець на бальшавікоў, як на сваіх заступнікаў, запамінаючы саўсім, што ідзе гэта нацыянальнае адраджэньне пад строгім кантролем партыі расейскіх бальшавікоў. Толькі ў 1924 годзе расейскія бальшавікі даюць магчымасьць беларусам разьвіваньня свае культуры ў сваёй — „*Савецкай* Соцыялістычнай Беларускай Рэспубліцы" і ў гэтым напрамку расейскія бальшавікі пайшлі нават вельмі далёка, яны як-бы адмаўляюцца ад верхавенства, творачы С. С. С. Р.

Але калі мы глыбей заглянем у ўнутранае жыцьцё С. С. Б. Р., дык бачым што беларускі народ трапіў у хітрыя кайданы, створаныя маскоўскім урадам. Гавары сабе пабеларуску, пішы пабеларуску, вучыся пабеларуску, маеш табе нават і дэкрэты на тваёй роднай мове, але рабі, браце, тое, што я табе прыказваю — вось мэханіка маскоўскага савецкага ўраду.

Дый мала гэтага: ўсе зборы, падаткі, гандаль—ўсё гэта не зьяўляецца ўласнасьцю Беларускага народу. Усё гэта ў руках маскоўскага ўраду. І ось калі добра разбяромся ўва ўсім гэтым, дык ня дзіва, што зьбіты з панталыку народ беларускі, сам ня ведае, што яму рабіць, куды ісьці і за кім ісьці?

Маняць яго з віду вельмі добрым пірагом, але як пакаштуеш—дык векбы не глядзеў на пірагі!

Дзяргач.

Плянэта Марс.

А поўначы 22-га гэтага жніўня плянэта Марс знаходзілася ў самай найбліжэйшай адлегласьці ад зямлі, а ласьне ў 56 мільёнах кілёмэтраў.

— А Міхась у хаце?

— Есь, ёсь, толькі цяперака ён з стрэльбай троху выйшаў...— адказаў Дзяніс.

— А! — ківанаў я галавой, — усё ходзіць...

— А як-жа... як устане, ось крыху паможа мне, дый шасьць у лес, толькі яго і бачылі, — сказаў дзед.

У хаце нас сустрэла прыгожая дзяўчына.

— Ну, пазнаеш, Ганка? — спытаўся Дзяніс у свае дачкі, якая прыглядалася да мяне.

— Пазнаю, — цьвёрда сказала яна.

— Як маецеся? — сказаў я, вітаючыся з ёю.

— Нічога, добра... Вось толькі маці памёрла... і дзеўчына спусьціла галоўку.

— Так Богу было трэба, — сказаў з цяжкім уздохам Дзяніс...

— Кніжак прывязьлі? — зьвярнулася яна да мяне.

— Вось, вось, — адказаў я і дастаў з кішаня цэлую пачку кніжак.

— Цікавыя?

— Усе кніжкі цікавыя,—перабіў яе Дзяніс.

— Ну, дзеўчына, давай нам чаю, есьці...

У гэты міг у хату ўвайшоў Янка з бутэлькай, кілбасай, хлебам і сырам у руках і ўсё гэта палажыў на стол.

— Ого! — падміргнуў Дзяніс, — з запасам!

— А, ось, Супрона сын даў гарэлкі, а яго жонка закуску, — адказаў я.

— Дык Пётра ажаніўся? — запытаў Дзяніс.

— Як бачыце, — адказаў я.

— Ну, давай Бог шчасьця! — сказаў ён.

Пакуль мы гутарылі з Дзянісам, Ганначка накрыла стол белым чыстым абрусом і прынясла кіпеўшы самавар.

— Гэта машынка — кіўнуў Дзяніс у бок самавара, — Міхасёва, ён прывез яе. Любіць піць гарбату ў гарачы дзень, кажа, што гэта ад жары першы ратунак, — засьмяяўся Дзяніс.

— Гэта праўда, памагае, але спачатку дык ня вельмі прыемна, але пасьля трэцяе шклянкі нават робіцца сьцюдзена, — адказаў я.

Калі мы пілі гарбату, прыйшоў Міхась.

Доўга мы гаманілі аба ўсіх справах і за гутаркай ня прымецілі, што на небе сьвяціў ужо месяц.

— Ну, пойдзем на сена,—сказаў Міхась.

Мы выйшлі з хаты. На падворку сядзела Ганначка.

— А вы што тутака робіце, а? — зьвярнуўся я да яе.

— Усё мары? а мары апанавалі відаць Вас, Ганначка? — запытаў я.

— Але! прыемна, бачыце, глядзець на далёкія зоркі, гэтак глядзіш на іх і колькі думак салодкіх, прыгожых пад ціхія чары іх надходзіць.

— Гэ, дык вы Ганначка, прыгожа гаворыце! — сказаў я, глянуўшы на яе.

— А што-ж, пасядзім на вольным паветры, — парадзіў Міхась.

— Ну, пасунься Ганначка, — сказаў ён і сеў побач з сястрою, абняўшы яе і прытуліўшы да сябе

— Сядай, Дзяргач, — дый паможам Ганначцы шукаць адказу на ўсе пытаньні ў зорак, — казаў Міхась.

Я сеў і мы пачалі гутарыць...

Ужо калі пачалі зоркі гаснуць на небе адна за аднэю, мы разыйшліся на адпачынак.

XII.

Возера Князь.

Ужо сонца стаяла высока, калі нас прыйшла будзіць Ганка.

— Уставай! — гаманіла яна, турзаючы Міхася, але ён мусіць знарок ня кратаўся, а наадварот пачаў храпсьці яшчэ мацней. Я расплюшчыў вочы.

— Ці ўстанеш ты, ці не? — турзала сястра брата.

— Хай сьпіць! — адказаў я.

— А вы ўжо ня сьпіцё, а толькі зьбіраліся і вас будзіць, ось як і брата, — казала яна.

Раптам Міхал падняўся і злавіў сястру за ногі.

— Ай! — крыкнула тая ад неспадзеўкі, і звалілася на брата.

— Ось я табе дам! Будзеш ведаць, як будзіць брата! — казаў Міхась і ўзяў яе казытаць.

Але Ганка хутка вырвалася з рук брата, і ўцякла.

— Прыходзьце піць гарбату! — крыкнула яна, выбягаючы з альтанкі.

Добра пад'еўшы, я з Міхасём пабралі стрэльбы і пайшлі на возера...

Ішлі мы гушчаром лесу па сьцежчы, якую добра ведаў Міхась.

— Гэтак, — казаў ён, — будзе бліжэй.

Дзяргач.

(Працяг будзе).

18-га верасьня 1909 году Марс быў у 58.155.889 кілёмэтрах ад нашае плянэты — Зямлі, — а нармальна ад Зямлі да Марса лічыцца — 150.000 мільёнаў кілёмэтраў.

Як ведама, гэтая плянэта вельмі цікавіць нашых, зямных, вучоных-астраномаў; адны даводзяць, што на Марсе ёсьць атмосфэра, блізкая сваім складам да зямное атмосфэры; другія робяць з гэтага вывад, што на Марсе ёсьць людзі, ці ў кожным выпадку жывыя істоты з высокім інтэлектам. Бывалі астраномы, якія даводзілі, што вядомыя „каналы“ на Марсе зроблены „марсіянамі - людзьмі“. Адзін з астраномаў, глядзеўшых праз тэлескоп на Марс з гары Юнгфрау ужо як быццам убачыў на гэтай плянэце сьнег.

Іншыя зноў астраномы запэўняюць, што ніякіх людзей-марсіян, ніякіх каналаў і ніякага сьнегу на Марсе няма дый быць ня можа і што „каналы“ — проста зьяўляюцца рэзультатам недасканальнасьці нашых тэлескопаў. Доказ гэтага бачаць у тым, што каналы відаць праз трубы меней дасканальныя.

Да спомненага моманту прыбліжэньня Марса да Зямлі астраномы ўсяго сьвету рыхтаваліся вельмі старанліва. На вяршынах шмат якіх гораў арганізованы былі часовыя обсэрваторыі, каб глядзець 22-га жніўня на Марс. Замерваліся адбіць фатаграфіі плянэты, а таксама ўвайсьці ў зносіны з марсіянамі, калі гэткія існуюць.

Сур'ёзныя вучоныя заяўлялі ўжо, што наўрад ці будзе адказ на ўсялякія сыгналы, якія напэўна былі даны 22 жніўня з Зямлі на Марс. Калі нават марсіяне існуюць, дык ці-ж могуць яны зразумець нашыя сыгналы? Камэндант Грээн, начальнік радыятэлеграфнае службы ў амэрыканскай арміі падчас сусьветнае вайны, адважна цьвердзіць, што цяпер нашыя шансы перагаварыць з марсіянамі ў 10 тысяч разоў большыя, як у 1909 годзе. Але-ж якою моваю да марсіян гаварыць?

Астраном Макс Афээ памясьціўся, каб сачыць за Марсам, у Ханатыле (рэспуб. Чылі ў Паўднёвай Амэрыцы) з тэлескопам, што павялічае ў 30.000 разоў; ён мог бачыць Марс 22-га жніўня гэтак добра, як-бы ён быў ад Зямлі ўсяго толькі ў 10.000 кілёмэтраў.

Прафэсар Мотрам зьмясьціў у „Daily Mail“ артыкул, у якім даводзіць, што Марс мае ўсе варункі, патрэбныя для істнаваньня жывых арганізмаў. Гэты вучоны ўжо калісьці „бачыў“ на Марсе лёд на полюсах, „бачыў“ дажджавыя хмары, ваду, траву ці лес каля „каналаў“, якія прафэсар прызнаў за вялізарнейшыя гідратэхнічныя будовы. Астраном Пікэрынг лічыць, што на Марсе тэмпэратура раўняецца 40° па Фарэнгэйту ніжэй за ноль. У кожным выпадку, калі марсіяне й істнуюць, дык яны вельмі непадобныя да людзей. Прафэсар Шарль Нордман пісаў, што 22-е жніўня ня зробіць перавароту ў астраноміі. Найбольшая рэч, якую можна было-б разглядзець праз найбольшы тэлескоп 22 жніўня на Марсе — павінна была раўняцца ня менш, як 30 кіл. Прасьцей кажучы, гэткі горад як Бэрлін, калі-б ён быў на Марсе, дык ня мог быць разгледжаны праз тэлескоп.

І гэта пры найлепшых атмосфэрычных варунках. А калі ў пунктах дзеля разгляду Марса 22-га жніўня была благая пагода — туман, дык апрача гэтага туману нічога й не ўдалося бачыць.

Цікава ўсё такі, што скажуць у бліжэйшым часе па гэтым пытаньні зямныя астраномы. Якія яшчэ навіны знайшлі яны на Марсе, падыйшоўшым 22-га жніўня да Зямлі амаль ня ў тры разы бліжэй, як знаходзіцца ён ад яе звычайна?

ПАЎСТАНЬНЕ Ў КЛАЙПЭДЗЕ.

Праз Рыгу з Клайпэды адтрыманы весткі, што паўстанчы рух, у якім з пачатку удзел бралі толькі нямецкія нацыяналісты, набірае цяпер усё больш шырэйшага характару. Рашучым момантам, які зрабіў уплыў на павялічэньне паўстанчага руху і выклікаў сымпатыю ўсяго насяленьня было распараджэньне Будрыса, абвешчанае 8-га жніўня аб увядзеньні на абшары Клайпэды ваеннага палажэньня і датарнаваньне да арыштованых згаворшчыкаў 6 гэтага жніўня над'звычайнага прасьледаваньня, якое прадбачыць кару сьмерці. Літоўскія ўлады ў Клайпэдзе ахоплены панікай. З Коўна выслана некалькі эшалонаў войска, якое мае задачу задушыць паўстаньне. Войска паступіла ў распараджэньне Будрыса.

Перад высылкаю на абшар Клайпэды войска літоўскі ўрад дэлегаваў міністра Круповіча дзеля навязаньня перагавораў з паўстанцамі, але місія гэта не дала ніякага рэзультату.

Бітва з бандытамі

ў вёсцы Мікалаеўшчыне.

У мінулы чацьвер аддзелы паліцыі разам з войскам разьбілі адну з найбольшых бандаў, якая вяла опэрацыі на крэсах ужо 3 гады. Банда хавалася ў вёсцы Мікалаеўшчыне, Сноўскае воласьці, Несьвіскага павету Банда рыхтавалася да новых нападаў на ваколічныя двары й мястэчкі.

Бандыты былі акружаны паліцыяй у некалькіх стайнях і бараніліся да апошняй магчымасьці. Выстраляўшы ўсю амуніцыю, яны атакавалі паліцыю ручнымі гранатамі.

У бітве, якая цягнулася больш як 4 гадзіны, забіты адзін шподовнік паліцыі, 4 бандыты і ранена некалькі паліцыянтаў. 3 бандыты затрыманы. Сярод забітых пазнаны вядомы бальшавіцкі камісар Бартош, стаяўшы на чале банды.

Вёска Мікалаеўшчына, дзе адбываўся бой, загаралася ад ручных гранатаў, кіненых бандытамі. Уланы, браўшыя удзел у прасьледаваньні бандытаў, ўзялі кулямёт і вялікі лік амуніцыі і ручных гранатаў.

ТУТЭЙШАЯ ХРОНІКА.

— **Юрыдычны падручнік.** Рэдактар выходзіўшае ў Вільні ў 1921 і 1922 г. г. беларускае газэты „Родная Страха“, Янка Бэкіш, рыхтуе да друку юрыдычны падручнік на беларускай мове.

— **Гісторыя беларускага тэатру.** Вядомы беларускі драматург, Ф Аляхновіч, канчае пісаную ім два гады „Гісторыю Беларускага Тэатру“. Калі знайдзецца выдавец, дык важная ў культурным беларускім жыцьці кніжка патрапіць выйсьці ў сьвет яшчэ ў гэтым годзе.

— **Павялічэньне дарагоўлі.** За прайшоўшы тыдзень цэны на рэчы першае патрэбы павялічыліся ў параўнаньні з папярэднім на 2,17 проц. Найболей падрасла цана на амэрыканскую і мясцовую пшанічную муку.

— **Бандыцкі напад.** Уночы з серады на чацьвер мінулага тыдня на Полацкім гасьцінцы ў 5 кілёмэтраў ад Лаварышак, шэсьць бандытаў напалі на Антона Стабінскага, які вяртаўся з Вільні ў Варняны. Бандыты, пагражаючы стрэльбамі, схапілі скрынку з гарэлкаю і схаваліся ў лес. Трэба заўважыць, што па чацьвяргох ужо два месяцы здараюцца бандыцкія напады на купцоў, якія вяртаюцца з Вільні, як на Полацкім, так і на іншых гасьцінцах.

— **Аб рэестрацыі чужаземцаў.** Асобы, якія падлягаюць рэестрацыі і не зарэестуюцца да 1-га верасьня, бязумоўна будуць высланы з Польшчы, ніякія просьбы й мотывы ўладамі ня будуць брацца пад увагу.

— **Рэестрацыя каля граніцы.** Па распараджэньню дэлегатуры ўраду адбываецца рэестрацыя усіх жыхароў пагранічных паветаў. Кожнаму жыхару будзе выдана пасьведчаньне жоўтага колеру, а на права хадзіць уночы—белага, з фатаграфічнаю карткаю. Купцы ў пагранічнай паласе адтрымаюць для права начнога руху зялёныя пасьведчаньні. Усе пасьведчаньні трэба адтрымаць у тыднёвы срок.

Аб сучасным стане беларускага мастацтва

(КУЛЬТУРНЫЯ АГУЛЫ)

(Глядзі № 14 „Грам. Голасу“).

II.

У першай часьці нашага артыкулу мы стараліся даць, колькі мага, верны і праўдзівы, *абраз* агульнага стану беларускага мастацтва, разглядаючы, адну за адной, ўсе яго галіны. Як мы бачылі стан гэны даволі-такі сумны й балючы.

Вось-жа цяпер трэба нам зьвярнуцца да *прычын*, якія гэткі стан выклікалі.

Шукаць іх трэба ў нашай мінуўшчыне! Прычын гэных было шмат, але бяссумліўна *галоўнай* з іх было *рэнэгацтва беларускага шляхоцтва.*

Вышэйшыя клясы, гэны *мозаг народу*, прыняўшы чужацкую мову, веру і культуру (нраз з чыста матар'яльных пабуджэньняў), і, гэткім чынам, здрадзіўшы свой народ і пакінуўшы яго без інтэлігэнцыі, якая ў тыя часы вербавалася выключна з тых-жа вышэйшых клясаў, — нанясьлі гэным самым сьмяротны удар беларускай культуры, пазбаўляючы яе творчых сілаў і асуджаючы на загубу!

Гэткім чынам здэнацыяналізованыя (спольшчаныя, або абмаскоўленыя) прадстаўнікі беларускіх шляхоцкіх родаў пакланяліся чужым багом, складаючы бясцэнныя ахвяры на іх аўтарох, у той час, калі родныя загоны мадзелі ў запушчэньні...

А што сярод гэных прадстаўнікоў здараліся, і нраз, адзінкі выдатныя, высока талентныя, якія сапраўды ўзбагацілі сваімі творамі і працамі ня толькі польскую ці маскоўскую, але і сусьветную культуру, робячы цэнныя ў яе ўклады, хай доказам таму паслужа некалькі прыкладаў, хоць-бы толькі з закранутае тут намі краіны Мастацтва.

Раней чым прыступіцца да вылічаньня, знаходзім патрэбным, у мэтах ухіленьня магчымых протэстаў з другога боку, ад'значыць наступнае: ў пытаньні адносна *прадстаўнікоў здэнацыяналізованых* (ў польскі ці маскоўскі бок), *беларускіх шляхоцкіх родаў* мы выразна падкрэсьліваем, што яны, ня гледзячы на пэўны *лёкальны патрыятызм* і *краёвую афарбоўку*, зьяўляюцца сапраўды *Палякамі, або Маскоўцамі* і, што зусім, на іх, *як на Беларусаў*, не прэтэндуем і ня маем ніякага намераў *анэктаваць* іх ад Польшчы ці Маскоўшчыны, каб уставіць іх ува ўласную гісторыю, — але адначасна з тым мы павінны ад'значыць і тое, што Беларускі народ, *ніколі не забудзе* што ўсё-ж такі гэныя *Палякі і Маскоўцы з паходжаньня Беларусы* і заўсёды гэным будзе гардзіцца, аплакваючы гэнебнае адступніцтва іхніх *беларускіх* продкаў.

Пасьля гэных увагаў пэройдзем да самых прыкладаў.

Вось-жа, бачым што *ў краіне Музыкі* тварцамі *нацыянальнае* польскае і маскоўскае музыкі зьяўляюцца Беларусы з паходжаньня — *Манюшка* і *Глінка!*

У краіне Малярства зноў-жа бачым з польскага боку хоць-бы напрыклад гэткага выдатнага артысту-маляра. як *Г. Вэйсэнгоф*, (нядаўна памёршага), *які паходзіў з беларускіх земляў* і ім-жа прысьвячаў львіную частку сваё творчасьці, асабліва-ж Палесьсю, якое адмаляваў у шмат якіх пэйзажах.

З другога боку, ведаем, што вядомы маскоўскі маляр *Рэпін*, паходжаньнем *з Віцебшчыны!*

У краіне Тэатру ад'значым хоць бы сабе такога слаўнага маскоўскага артысту як *Качалаў*, паходжаньнем з *Віленшчыны*, выступаўшы апошнімі часамі ў Вільні, які нават і *лічыць сябе Беларусам!*

Трэба памятаць, што гэта толькі простыя з боку прыклады, што гэткіх адзінак ня толькі ў краіне мастацтва але і ў другіх можна вылічаць дзесяткамі, калі толькі, не ляпуючыся, пільна іх пашукаць.

Бо, вось, *калі абграніч`мся да ворак першай велічыні* дык пабачым, што *Беларусы*, апрача ўжо вышэй памянёных, вядомых кампазытараў *Манюшкі і Глінкі, далі* ў краіне Літаратуры, гэткіх геніяў, як *Міцкевіч* і *Сенкевіч* у Палякоў і *Дастаеўскі* ў Маскоўцаў; дый у канцы ў краіне ваеннай гэткіх талентных ваяўнікоў як *Ходкевіч* і *Касьцюшка!* Гэтыя слаўныя іменьні ясна даказваюць нам тое, што прычынай сучаснае ўбогасьці беларускага мастацтва зьяўляюцца выключна анармальныя варункі беларускага культурнага і нацыянальнага жыцьця ў працягу большай часткі беларускае гісторыі, ніколі-ж ня духоўная хлявізна, ці бясплоднасць беларускага народу!

А калі гэта так, дык выйшаўшая з народных нетраў, *з беларускае вёскі, новая беларуская інтэлігэнцыя, бяссумліўна патрапіць папрвіць* і папоўніць тыя *страты*, якія панясла беларуская культура, дзякуючы *рэнэгацтву старое* родавае шляхоцкае *інтэлігэнцыі*. І яна ўжо папаўняець!

Доказам гэнаму — пышны расьцьвет беларускае літэратуры, памыснае разьвіцьцё беларускага Тэатру, здабыткі беларускае Музыкі і Песьні, што ўвесь час павялічваюцца.

Усё гэтае даказвае, што сярод нас не павінна быць месца для суму, што сьветлая *Будучына* належыць да нас!

Язэп Сьветазар.

Выдавец: Беларускае Грамадзянск. Сабраньне. Рэдактар: Язэп Салавей. Друкарня „Lux“, вул. Жэлігоўскага, 1. Тэлеф. № 203.